# ЖЫЦЦЁ ПАЧЫНАЛАСЯ Ў Л

3.12.92

Г…

Летам Лунінец наведала група ўраджэнцаў нашага горада, якія да вайны ці адразу пасля яе выехалі за мяжу. Сярод іх мяне зацікавіў чалавек, з якім пры знаёмстве адбыўся кароткі дыялог .

– Я жыву ў кібуцы, – прадставіўся Меір Друкер.

– Цікава. Па-нашаму, вы калгаснік.

– Не, калгасы супраць кібуцаў – гэта прыватныя гаспадаркі. Хочаце, раскажу больш падрабязна?

Зразумела , папрасіла разгаворлівага старога наведаць рэдакцыю і запісала размову з ім. Прапаную спачатку, так бы мовіць, біяграфічную частку, расказаную пра сябе Меірам Друкерам.

Мой бацька быў краўцом. Мы жылі ў доме Цукермана па вуліцы Садовай. Асноўным насельніцтвам Лунінца былі яўрэі і беларусы. Палякаў было мала — толькі начальнікі, паліцыя ды чыгунка. Кіраўніком магістрата да 1939 года быў беларус Станкевіч, выбраны народным галасаваннем. А вось газеты былі ўсе польскія, прыходзілі з Варшавы. Памятаю назвы некаторых: „Хайн", „Момэнт", „Вячэрняя газета".

Як і ўсе аднагодкі, быў прызваны ў польскую армію. Пасля яе разгрому ў верасні 1939-га года вярнуўся дамоў да бацькоў.

Тут ужо была новая ўлада. Я меў пачатковую адукацыю, таму мяне паслалі на фінансавыя курсы ў Баранавічы. Праз 3 месяцы вучобы прызначылі інспектарам Лунінецкай ашчаднай касы. Хутка мяне прынялі ў камсамол. Не, білетаў не ўручалі, але перад уступленнем трэба было вытрымаць сур'ёзны экзамен на правільнае разуменне палітычнай сітуацыі. Усе адказныя работнікі станавіліся камсамольцамі, інакш ім бы не давералі заданні партыі. А даводзілася выязджаць у камандзіроўкі на тыдзень і больш і весці прапагандысцкую работу сярод вясковага насельніцтва.

Памятаю, што начальнікам фінансавага аддзела быў Паўлюкоў. А ашчадная каса знаходзілася ў каўбасным цэху Пятрова і Матусевіча — гэта гарадчукі з Давыд-Гарадка.

Пачалася вайна. У армію мяне не ўзялі. Даручылі везці дакументы ў Гомель. А напярэдадні прыснілася памершая сястра, якая маліла: не заставайся, ідзі адсюль. У мяне быў вагон, я прасіў маму ехаць са мной. Яна не згадзілася...

У Гомелі трапіў пад бамбёжку. Вагон быў разгромлены. Дабраўся да Чарнігаўскай вобласці, вельмі перажываў, што згубіў дакументы.

Потым пачаліся звычайныя шляхі эвакуацыі. Ташкент. З-за эпідэміі тыфу пераехаў у Ленінабад. Там таксама працаваў інспектарам аблфінаддзела па вясковых і гарадскіх падатках. Адтуль паслалі на працоўны фронт — Куйбышаў, Чэлябінск. Гэта былі будоўлі НКУС, ці, як цяпер іх часцей называюць, — ГУЛАГ, на чале якога стаяў Рапапорт. Побач са мной працавалі зняволеныя ці штрафнікі, знятыя з фронту. Кармілі нас вельмі добра, але і працаваць прымушалі. Я быў брыгадзірам і адказваў за абслугоўванне рабочых.

Вайна закончылася. Я ўжо ведаў, што ўсе мае родныя былі знішчаны ў Лунінцы. Улічваючы тое, што нарадзіўся ў Польшчы, мне дазволілі выезд за мяжу. Па дарозе заехаў у Лунінец. Толькі на 2 гадзіны. Пакланіўся яўрэйскім магілам — і ў цягнік...

У Польшчы не затрымаўся, паехаў у Італію. Рым, Мілан... Вырашыў ехаць у Лацінскую Амерыку, пачаў вывучаць іспанскую мову. З 1949 года стаў працаваць ва Уругваі. Ажаніўся на дзяўчыне з Польшчы, якая туды выехала з бацькамі яшчэ ў 10-гадовым узросце. 15 гадоў было аддадзена гэтай краіне. У 1964-м прыехаў з сям'ёй у Ізраіль і стаў працаваць у кібуцы.

## ПРАЦОЎНАЕ ВЫХАВАННЕ — З 6 ГАДОЎ

— У Ізраілі прыкладна 260-280 кібуцаў. 7-8 працэнтаў займаюцца толькі прамысловай вытворчасцю, але пераважная большасць спецыялізуецца на сельскай гаспадарцы ці змешаныя. Наш кібуц называецца Ейн-Кармель і адносіцца да апошніх. У нас ёсць завод, які вырабляе пластмасавыя рэчы, але асноўны прыбытак дае вырошчванне бананаў. Членаў у кібуцы 500 чалавек, з іх працуючых — прыкладна палова. Рабочы час дыферэнцыраваны — маладыя працуюць больш, пажылыя — менш. На пенсію мужчыны выходзяць у 65 гадоў, жанчыны — у 60.

**— Хто кіруе кібуцам?**

— Вышэйшы заканадаўчы і выканаўчы орган — агульны сход, які праводзіцца раз на тыдзень, у пятніцу. На ім выбіраецца тайным галасаваннем упраўленне — 9 адказных работнікаў, з якіх толькі 2 штатныя — кіраўнік і фінансіст, для астатніх гэта грамадская нагрузка. Тэрмін знаходжання на выбарнай пасадзе — 2 гады. Хто не спраўляецца, таго перавыбіраюць раней. Некаторыя і самі падаюць у адстаўку, калі іх занадта крытыкуюць.

**— Як можна стаць членам кібуца?**

— Гэта пытанне вырашае агульны сход, дзе правам голаса валодаюць тыя, каму больш як 18 гадоў. У кібуцы прымаюць людзей да 35 гадоў. Паўгода — выпрабавальны тэрмін, потым — умоўнае, так мовіць, членства, і толькі яшчэ праз год можна стаць паўнапраўным членам кібуца. Тыя, хто ўступае, звычайна працуюць па спецыяльнасці, калі валодаюць патрэбнай, або вучацца на такую. Сродкаў, якія яны зарабляюць за гэты тэрмін, дастаткова для кампенсацыі бясплатнага жылля і харчавання.

Калі людзі дрэнна працуюць, іх могуць выключыць з кібуца. Хаця такія выпадкі вельмі рэдкія. А вось праблема ўзнікла з рэпатрыянтамі — яўрэямі з былога Савецкага Саюза, якія толькі прыехалі ў Ізраіль, яшчэ нічога для дзяржавы і грамадства не зрабілі, а ўжо адразу хочуць жыць так, як карэнныя жыхары, атрымаць

## ...УНІНЦЫ

...АСЦЁЎНЯ „ЛН"

...усе перавагі цывілізацыі. У кібуцы гэтыя прэтэнзіі не здзяйсняюцца.

**— Што ўяўляе сабой жыллё ў кібуцы?**

— Усе дамы ў нас аднапавярховыя. Я, напрыклад, адзін жыву ў трохкватэрным будынку, у мяне 3 пакоі агульнай плошчай 65 кв. метраў. Двое маіх сыноў з сем'ямі жывуць асобна.

Асобны будынак — для моладзі, дзе юнакі і дзяўчаты атрымліваюць пакой па дасягненні 15 гадоў.

Кватэра лічыцца маёй, але гэта не прыватная маёмасць. Я магу жыць у ёй хоць 200 гадоў, але ні прадаць, ні падарыць не магу. Яна бясплатная, ні за газ, ні за ваду, ні за святло не плачу. Шчыра кажучы, мала гэтым карыстаюся. Хаця ў кожнай кватэры ёсць кухні, але ўсе кібуцнікі харчуюцца ў грамадскай сталовай.

**— Як жа выхоўваецца такі калектывізм?**

— Калі дзіця нараджаецца, некалькі месяцаў яно знаходзіцца побач з маці, якая на гэты час вызваляецца ад работы. Потым дзіця перадаецца ў дзіцячы сад, дзе ім займаецца выхавальніца. Садкоў 2 — для самых маленькіх і для школьнікаў. Дзеці знаходзяцца там з 7 да 16 гадзін, потым гуляюць дома з бацькамі, а ў 20 гадзін ідуць у дзіцячы сад спаць.

Праўда, цяпер па жаданню двух бакоў дзеці могуць начаваць з бацькамі.

З 6 гадоў вучым дзяцей, што азначае работа. Бяром з сабой на свае рабочыя месцы і паказваем, чым займаемся, і яны ў сілу сваіх дзіцячых магчымасцей імкнуцца дапамагаць. Падрастаючы, кожны выбірае адзін дзень у тыдзень, калі ён працуе на нейкім аб'екце: у сталовай, дзіцячым садзе, на іншых работах. І так да 12 гадоў, а потым дзіцячая дапамога становіцца больш істотнай. Яны працуюць у розных галінах гаспадаркі па 2-3 месяцы ў кожнай. Школьнікі маюць толькі 1 месяц канікулаў — жнівень, а увесь ліпень таксама працуюць на кібуц...

Школа існуе адна на некалькі кібуцаў. 6 класаў — абавязковая сярэдняя адукацыя, яшчэ 5 — па жаданню. Потым, хто мае здольнасці, могуць паступаць ва ўніверсітэт, калі кібуц вырашыць плаціць за яго. Але перад гэтым абавязкова адслужыць у арміі — з 18 гадоў прызываюць дзяўчын (на 2 гады) і хлопцаў (на 3 гады). Кажуць, што лепшыя салдаты і афіцэры ў ізраільскай арміі — кібуцнікі.

**— А як жа ацэньваецца працавітасць кібуцніка?**

— За работу нам плацяць, але не на рукі, усё пералічваецца на ашчадную кніжку. Калі мне штосьці патрэбна — іду і мне даюць. У нядзелю, панядзелак, чацвер і пятніцу працуе магазін, дзе таксама магу ўзяць усё, што захачу. З майго рахунку здымаецца патрэбная сума. Але кожны год у мяне застаецца пэўная частка сродкаў, таму раз у 3 гады маю магчымасць ехаць у замежнае вандраванне. Дарэчы, да 50 гадоў кібуцнікі маюць водпуск у 10 дзён, толькі старэйшыя — 1 месяц.

У нас няма шпіталя — калі захварэю, кібуц дае мне машыну наведаць урача. У нас ёсць два Дамы культуры — для старэйшых і для маладых. Яшчэ кожны член кібуца мае аўтобусны білет, па якім можа ехаць у любы канец Ізраіля.

●●●

Размова не магла працягвацца бясконца, хаця мяне цікавіў яшчэ шэраг пытанняў. На развітанне Меір Друкер папрасіў даслаць яму нашу раённую газету. Я выканала просьбу. І вось ліст з Ізраіля: „Вашу газету чытае увесь кібуц, таму што кожны хоча ведаць, чым жывуць на радзіме яго ці яго бацькоў..." Прыемна, што „Лунінецкія навіны" набылі замежнага чытача. А нашым землякам, якія хочуць даведацца яшчэ пра якія-небудзь звычкі і традыцыі ізраільцян, прапаную даслаць у рэдакцыю пытанні, якія перашлем у Ізраіль.

Гутарыла
Т. КАНАПАЦКАЯ.

---

...пасведчанне інваліда дзяцінства ...ВІЧА Фёдара Фёдаравіча, прашу...

---

Калектыў калгаса „Рассвет" выказвае глыбокае спачуванне даярцы **Марыі Рыгораўне РУДОЙ** і трактарысту **Паўлу Рыгоравічу ПАЎЛОВІЧУ** ў сувязі са смерцю **маці**.

---

Калектыў работнікаў Лунінецкага райаграпрамзабеспячэння глыбока смуткуе з прычыны смерці вартаўніка

**Вікенція Цімафеевіча ФЕНЧУКА**

і выказвае шчырае спачуванне родным і блізкім нябожчыка.

---

Калектыў Лунінецкага хлебазавода выказвае глыбокае спачуванне дазіроўшчыку сыравіны **Кацярыне Харытонаўне ГОПТА** ў сувязі з напаткаўшым яе горам — смерцю **маці**.

---

Адміністрацыя і прафкам Лунінецкай станцыі па барацьбе з хваробамі жывёл выказвае глыбокае спачуванне тэхработніцы райветстанцыі **Варвары Мікалаеўне ГРЫНЕВІЧ** і загадчыку гаспадаркі **Мікалаю Васільевічу ГРЫНЕВІЧУ** з выпадку напаткаўшага іх гора — смерці дарагога ім чалавека — **маці і цешчы**.

---

Калектыў Вулькаўскай 1 СШ выказвае глыбокае спачуванне настаўнікам школы **Валянціне Спяпанаўне ЛАЗІЦКАЙ** і **Мікалаю Іванавічу ЛАЗІЦКАМУ** з прычыны напаткаўшага іх вялікага гора — смерці **бацькі і цесця**.

---

Вучнёўскі прафкам Лунінецкага ПТВ-160 выказвае глыбокае спачуванне навучэнцу групы №11 **Аляксандру КОВАЛЮ** з выпадку напаткаўшага яго гора — смерці **маці**.

---

Галоўны рэдактар
А. М. ВЫШЫНСКІ.

*Аб'ём — 1 друкаваны аркуш.*
*Фармат 600х420 мм.*
*Індэкс 63946.*
*Тыраж 8.298 экз.*

*Падпісана да друку ў 17-00.*